# ПАХОДЖАННЕ І ЗМЕСТ ГІСТАРЫЧНАГА ПАНЯЦЦЯ «ПЯЦІГОРСКІЯ ЧАРКАСЫ» Ў ГІСТАРЫЧНЫХ КРЫНІЦАХ РАННЯГА НОВАГА ЧАСУ І ЯГО ЗНАЧЭННЕ ДЛЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ГІСТОРЫІ АДЫГАЎ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII стст.: ПАСТАНОЎКА ПРАБЛЕМЫ

**А. М. Латушкін**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, Latushkin@bsu.by*

Аўтарам узнімаецца пытанне субэтнічнай прыналежнасці адыгаў, якія перасяліліся на тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага ў 60-я гг. XVI ст. Важнасць яго абумоўлена рознай знешнепалітычнай арыентацыяй субэтнічных груп адыгаў, размешчаных у межах араэала іх карэннага пражываня на тэрыторыі паўночна-каўказскага рэгёна ў другой палове XVI – першай палове XVII стст. Гэта выражалася ў тым, што па стане на другую палову XVI ст. адыгі заходнія (жанэ, бесленей і інш.). традыцыйна знаходзіліся ў саюзе з Крымскім ханствам і Асманскай імперыяй, а ўсходнія адыгі (кабардзінцы) — з Рускай дзяржавай. Аднак іх знешнепалітычны вектар мог змяняцца. Гэты фактар набываў істотнае значэнне ва ўмовах Інфлянцкай (Лівонскай) вайны 1558–1583 гг., а таксама ўлічваўся пры распрацоўцы праекту стварэння ў Еўропе т. зв. «антытурэцкай лігі». У абодвух выпадках планавалася выкарыстанне ваеннага патэнцыялу адыгаў, які разглядаўся як значны. Усё азначанае робіць мэтазгодным вызначэнне рэгёну паходжання адыгаў у ВКЛ, а таксама высвятленне зместу і значэння этнонімаў, якія выкарыстоўваліся тут у дачыненні да іх. Прыярытэтным выступае пытанне субэтнічнай прывязкі ў змесце распаўсюджанага ў ВКЛ паняцця «пяцігорскія чаркасы» і яго элементаў.

***Ключавыя словы:*** Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае; Руская дзяржава; адыгі; субэтнічная група; пяцігорскія чаркасы; пяцігорцы; чэркесы; Кабарда.

# ПРОИСХОЖДЕНИЕ И СОДЕРЖАНИЕ ИСТОРИЧЕСКОГО ПОНЯТИЯ «ПЯТИГОРСИКЕ ЧЕРКАСЫ» В ИСТОРИЧЕСКИХ ИСТОЧНИКАХ РАННЕГО НОВОГО ВРЕМЕНИ И ЕГО ЗНАЧЕНИЕ ДЛЯ ИЗУЧЕНИЯ ИСТОРИИ АДЫГОВ В ВЕЛИКОМ КНЯЖЕСТВЕ ЛИТОВСКОМ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XVI – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XVII ВЕКА: ПОСТАНОВКА ПРОБЛЕМЫ

**А. Н. Латушкин**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, Latushkin@bsu.by*

Автор поднимает вопрос о субэтнической принадлежности адыгов, переселившихся на территорию Великого Княжества Литовского в 60-е гг. XVI в. Ее значение обусловлено различной внешнеполитической ориентацией адыгских субэтносов, находящихся в ареале их естественного обитания на территории Северо-Кавказского

региона во второй половине XVI – первой половине XVII вв. Это выражалось в том, что со второй половины XVI в. западные одыги (Жанэ, Бесленей и др.). традиционно имели более тесные связи с Крымским ханством и Османской империей, а восточные адыги (кабардинцы) — находились в союзе с Русским государством. Однако их внешнеполитический вектор мог изменяться. Этот фактор приобрел существенное значение в условиях Инфлянтской (Ливонской) войны 1558–1583 гг., а также был учтен при разработке проекта создания в Европе так называемой «антитурецкой лиги». В обоих случаях планировалось использовать военный потенциал одыгов, который считался значительным. Все вышеизложенное делает целесообразным определение региона происхождения адыгов в ВКЛ, а также уточнение содержания и значения использованных здесь по отношению к ним этнонимов. Приоритетным является вопрос субэтнических связей в содержании понятия «пятигорские черкасы» и его элементов, распространенного в ВКЛ.

***Ключевые слова:*** Великое Княжество Литовское, Русское Жемаитское; Русское государство; адыги; субэтническая группа; пятигорские черкасы; пятигорцы; черкесы; Кабарда; картографические документы; письменные исторические источники.

# THE ORIGIN AND CONTENT OF THE HISTORICAL CONCEPT "PYATIGORSK CHERKASSIANS" IN THE SOURCES OF THE EARLY MODERN TIME AND ITS SIGNIFICANCE FOR STUDYING THE HISTORY OF ODIGAS IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE SECOND HALF OF THE 16 – FIRST HALF OF THE 17 CENTURY: STATEMENT OF THE PROBLEM

**A. M. Latushkin**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, Latushkin@bsu.by*

The author raises the issue of the subethnic affiliation of the Adyghe who migrated to the territory of the Grand Duchy of Lithuania in the 1560s. Its importance is due to the different foreign policy orientations of the Adyghe subethnoses in their natural habitat in the North Caucasus region in the second half of the 16th – first half of the 17th centuries. This was expressed in the fact that from the second half of the 16th century, the western Odyghe (Zhane, Besleney, etc.) traditionally had closer ties with the Crimean Khanate and the Ottoman Empire, while the eastern Adyghe (Kabardians) were in alliance with the Russian state. However, their foreign policy vector could change. This factor acquired significant significance in the context of the Inflyant (Livonian) War of 1558–1583, and was also taken into account when developing the project to create the so-called "anti-Turkish league" in Europe. In both cases, it was planned to use the military potential of the Odyghe, which was considered significant. All of the above makes it expedient to determine the region of origin of the Adyghe in the GDL, as well as to clarify the content and meaning of the ethnonyms used here in relation to them. The issue of sub-ethnic connections in the content of the concept of "Pyatigorskye Cherkasy" and its elements, widespread in the GDL, is of priority.

***Keywords:*** Grand Duchy of Lithuania, Russian Samogitian; Russian state; Adyghe; sub-ethnic group; Pyatigorsk Cherkassians; Pyatigorsk people; Circassians; Kabarda; cartographic documents; written historical sources.

У 60-я гг. XVI ст. у Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае (далей — ВКЛ) перасяляецца некалькі адыгскіх князёў — выхадцаў з Паўночнага Каўказа: Кудадэк-Аляксандр («Олешка») Сібокавіч, Гаўрыла Камбулатавіч Пяцігорскі, Цямрук Шымковіч Пяцігорскі, Касім Камбулатавіч Пяцігорскі, Давыд Кансанкавіч Пяцігорскі і інш. [12; 21; 20; 6; 7; 8]. Яны выяжджаюць сюды разам са сваёй світай, падданымі, аршаком. Адыгі траплялі на тэрыторыю Беларусі пераважна двумя шляхамі: праз Крым і землі Ўкраіны; праз Рускую дзяржаву (нешматлікія выпадкі, нелегальна)[1].

Адыгі — адна з самых буйных этнічных супольнасцей на Каўказе. Згодна з данымі расійскага ўсходазнаўцы, доктара гістарычных навук А. М. Някрасава (1958–2014) у апошняй чвэрці XV–XVI стст. межы рассялення адыгаў на Паўночным Каўказе былі наступнымі: на захадзе — Чарнаморскае ўзбярэжжа не паўднёвей сучаснага Туапсэ, да пачатку ж XVI ст. — уключаючы і ўсходняе ўзбярэжжа Азоўскага мора на паўднёвы-захад ад вусця р. Дон; на поўначы — р. Кубань, у раёне г. Бештаў — рэкі Кума і Церык; на ўсходзе — верхняе цячэнне рэк Церык і Сунжа; на поўдні — Вялікі Каўказскі хрыбет. На гэтых землях у той час жылі таксама іншыя народы, якія не адносяцца да адыгаў — балкарцы, карачаеўцы, абазіны, татары, армяне і інш. Дзяржавы-суседзі адыгаў у азначаны час: на захадзе — Крымскае ханства васальнае Асманскай імперыі; на поўначы — Вялікая Арда, пазней — Нагайская Арда; на ўсходзе — феадальныя ўладанні Дагестана, сярод якіх самымі буйнымі былі дагестанскія шамхальствы Казікумухскае і Цюменскае княства; у вярхоўях р. Церык — асеціны; на поўдні і паўднёвым-захадзе — грузінскія княствы і Абхазія [13, с. 67]. У этнапалітычным плане тэрыторыя, што разглядаецца, дзяліліся на дзве буйныя часткі: Заходнюю (Закубанскую) Чэркесію і Ўсходнюю Чэркесію — «Кабарду» з мяжой ад гары Эльбрус у паўночным напрамку да вытокаў р. Кума [6, с. 71]. Сама Кабарда ў другой

[1] Пад тэрмінам «Руская дзяржава» у даным даследаванні трэба разумець дзяржаўнае ўтварэнне, якое ўзнікла ў канцы XV ст. ў выніку далучэння да Вялікага Княства Маскоўскага шэрагу паўночна-ўсходніх рускіх княстваў у перыяд кіравання Івана III і працягвала сваё развіццё ў пазнейшы перыяд. У гістарычнай навуцы Беларусі пакуль не склалася ўстойлівай тэрміналогіі для абазначэння «Рускай дзяржавы» ў перыяд канца XV – пачатку XVII стст. Варыянты назвы, што ўжываюцца ў гістарыяграфіі, наступныя: Вялікае княства Маскоўскае, Маскоўская дзяржава, Руская цэнтралізаваная дзяржава, Руская дзяржава, Расійская дзяржава, Рускае царства, Расійскае царства (абодва апошнія — у дачыненні да перыяду не раней 1547 г.). Дыскусія па дадзенай праблеме — не заверашана. Аўтар абірае названы тэрмін умоўна, як той, што мае больш працяглую гістарыяграфічную традыцыю ў дачыненні да часу, ахопленага ў працы, а таксама з улікам факту непрызнання ў ВКЛ у гэты час царскага тытула вялікага князя маскоўскага Івана Васільевіча.

палове XVI – першай палове XVII стст. падзялілася на Вялікую і Малую. Згодна з данымі гісторыка адыгейскага народа першай паловы XIX ст. Ш. Б. Ногмава (Нагумэ, Шора Бекмурзавіч, 1794–1844) падзел на Вялікую і Малую Кабарду аформіўся толькі ў XVII ст. Вялікая Кабарда пры гэтым ахоплівала Паўночныя раёны Вялікага Каўказскага хрыбта, землі на ўсход ад гары Эльбрус да рэк Малкі і Церыка. Малая Кабарда (Таўсултанія) — раён паміж правым берагам Церыка і Кабардзінскім хрыбтом [14, с. 93–94; 15, рис. 1; 19; 9; 11, с. 114–115].

У 1860-я гг. і ў савецкі час арэал рассялення адыгаў і іх цэласнасць як этнаса штучным шляхам былі парушаны. У 1920-я–1950-я гг. адыгскі народ быў раздзелены на некалькі частак, а яго тэрыторыя — на шэраг тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак у складзе Расіі. За іх насельніцтвам агульнага адыгскага паходжання замацаваліся розныя назвы: жыхары Кабардзіна-Балкарскай Аўтаномнай ССР — «кабардзінцы»; жыхары Карачаева-Чэркескай Аўтаномнай вобласці Стаўрапольскага края, з 30.11.1990 г. Карачаева-Чэркескай Аўтаномнай ССР у складзе РСФСР — «чэркесы»; жыхары Адыгейскай Аўтаномнай вобласці Краснадарскага краю і іншых тэрыторый Краснадарскага краю — «адыгейцы» або «шапсугі». Такі ж стан з этнічным абазначэннем адыгаў у цэлым захоўваецца і сёння, нягледзячы на афіцыйнае заключэнне Расійскай Акадэміі Навук зробленае ў 2010 г. аб тым, што адыгі (чэркесы) — адзіны народ. У асяроддзі саміх адыгаў экзаэтнонім «чэркесы» як абагульняючы для ўсіх адыгаў таксама мае прызнанне. Ён абгрунтоўваецца сугучнай назвай, пад якой рэгіён Паўночнага Каўказа фігуруе на гістарычных мапах. Аднак, праярытэтнае месца пры самаідэнтыфікацыі займае назва — «адзіга» або «адыгэ». Гэта — эндаэтнонім (саманазва) этнасу. Ён будзе выступаць у якасці асноўнага тэрміна для абазначэння гэтага аб'екта ў нашым даследаванні.

У крыніцах айчыннага паходжання перыяду Ранняга Новага Часу гісторыка-геаграфічны рэгіён карэннага пражывання адыгаў атрымаў назвы «Пяцігор'е», «Пяцігорская зямля», «Кабарда», а жыхары названых зямель — «пяцігорцы», «чаркасы», «пяцігорскія чаркасы», «пяцігорскія татары». Назва «Пяцігор'е» паходзіць ад гары «Бештаў», што з татарскай мовы перакладаецца як «пяць гор». Гэты геаграфічны аб'ект захаваўся да нашага часу і знаходзіцца на поўдні Стаўраполькага краю Расійскай Федэрацыі. Ён мае пяць вяршынь, якія ўзніклі ў выніку геалагічных працэсаў вулканічнай прыроды. Тэрыторыі на поўдзень адсюль спрадвеку насялялі адыгі.

Факт з'яўлення «пяцігорцаў» на беларускіх землях у другой палове XVI ст. — праява складаных і, разам з тым, актыўных працэсаў фарміравання новага парадку і баланса сіл на велізарным абшары Ўсходняй Еўропы

і Паўночнага Прычарнамор'я ў канцы XV – пачатку XVI стст., выкліканых знікненнем з палітычнай мапы свету Вялікай Арды. Спецыялістамі даная падзея трактуецца як пачатак новага этапу ў гісторыі міжнародных адносін краін Усходняй Еўропы [13, с. 106]. З таго часу ключавым фактарам у супрацьстаянні двух асноўных контрагентаў міжнароднай палітыкі ў рэгіёне — ВКЛ і Рускай дзяржавы — становіцца Асманская імперыя (Турцыя) і Крымскае ханства. Ва ўмовах частых войнаў ВКЛ і Рускай дзяржавы ў першай палове XVI ст. і асабліва падчас найбольш маштабнай з іх — Інфлянцкай (Лівонскай) вайны, крымскія татары ўсё больш актыўна выкарыстоўваюцца дыпламатыяй ВКЛ у сваіх знешнепалітычных інтарэсах, выступаюць на баку каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх супраць у іх ваенным супрацьстаянні са знешнімі ворагамі. Наладжванне адносін з Крымам у сваю чаргу садзейнічала пашырэнню кантактаў ВКЛ з рэгіёнам Усходняга Прычарнамор'я і Каўказам. Народы Паўночнага Каўказа знаходзіліся на памежжы ўплываў адразу некалькіх магутных варожых адна адной ваенна-палітычных сіл, а менавіта: Турцыі і Крыма, Ірана, Нагайскай Арды, Рускай дзяржавы. У змаганні за сваё існаванне яны вымушаны былі звяртацца да розных стратэгій выжывання. Сярод іх вылучаюцца дзве: 1) ваенны саюз з Рускай дзяржавай; 2) падпарадкаванне Крымскаму ханству і праз яго — асманам. Абодва варыянты так або іначай прадугледжвалі выкарыстанне адыгаў іх саюзнікамі-патронамі ва ўласных ваенна-палітычных мэтах. Аднак першы шлях выглядаў больш прывабным. Ён абяцаў узаемную ваенна-тэхнічную дапамогу, умацаванне абароназдольнасці краю. Акрамя таго — не прадугледжваў цяжкой даніны ў тым ліку — жывой, з ліку саміх адыгаў (т. зв. «ясыр»), як таго патрабавалі крымскія ханы[2]. Злучэнне з хрысціянскай дзяржавай гэтым не пагражала. Разам з тым, прыродныя ўмовы Каўказа дазвалялі таксама такі варыянт дзеянняў, як балансаванне паміж рознымі цэнтрамі сілы,

[2] «Ясыр» ад «есір» (esir) — у асмана-турэцкай мове — «раб». Згодна з данымі знаўцы гісторыі збройнай вытворчасці на Каўказе Э. Г. Аствацатуран з канца XV ст. пры заняцці трону ў Крыме кожным новым ханам адыгі мусілі дасылаць туды 300 рабоў хлопчыкаў і дзяўчынак [3, с. 16]. Адзін з эпізодаў такіх «саюзных узаемаадносін» у перыяд XVI ст. зафіксаваны ў пазнейшым кароткім апісанні гісторыі кабардзінцаў, створаным прадстаўнікамі расійскіх уладаў на аснове звестак атрыманых ад саміх адыгаў: «…И в то ж время боясь кубанцов, что б их не разорили, давали в Крым кабардинцы ясырей вместо дани в год по десяти человек» (Изъяснение о кабардинских народах с краткими сведениями о их расселении и принятии российского подданства, присланные в Коллегию иностранных дел из крепости Святого Креста, 1732 г. ранее апреля 27) [11, с. 64]. Падрабязней аб месцы «ясыра» ва ўзаемаадносінах Крыма і Турцыі з Польшчай, ВКЛ і Рускай дзяржавай у XVI–XVII стст., ролі і становішчы рабоў у турэцкім грамадстве гл. артыкул В. Хензеля [17].

захаванне незалежнасці дзякуючы адыходу ў выпадку небяспекі ў цяжкадаступныя горныя раёны, выкарыстанне іх для абароны. Менавіта гэты шлях і быў задзенічаны адыгамі-горцамі найбольш часта і паспяхова, стаў характэрнай для іх тактыкай барацьбы. Аднак у перыяд Новага Часу з развіццём агнястрэльнай зброі, артылерыі ён становіўся ўсё больш абмежаваным і не адпавядаў мэтам стабільнага і паступальнага развіцця. Акрамя таго, кожная са стратэгій несла з сабой і выбар рэлігіі — ахрышчаныя ў Сярэднявеччы па візантыйскаму абраду, адыгі к XVI ст. зноў вярнуліся да вераванняў дахрысціянскіх часоў.

Ва ўмовах пастаяннай ваеннай пагрозы з боку Крыма шэраг прадстаўнікоў кіруючай княскай эліты з розных рэгіёнаў Паўночнага-Каўказа ў 50-я гг. XVI ст. (1552, 1555, 1557) заключаюць саюз і пераходзяць пад пратэкцыю вялікага князя маскоўскага [10]. Такія дамовы ў гісторыі народаў Каўказа мелі назву «шэрць»[3]. З другога боку, частка заходне-адыгскіх князёў трапляе ў даннікі турэцкіх султанаў і крымскіх ханаў. Пры гэтым прыхільнасць адыгаў да аднойчы абранага саюзніка не заўжды была ўсеагульнай і трывалай. Здараліся пераходы на той або іншы бок з уласнымі палітычнымі мэтамі, напрыклад, для заручэння падтрымкай у міжусобнай барацьбе за верхавенства і ўладу паміж рознымі родавымі кланамі адыгаў. Можна таксама заўважыць, што нягледзячы на азначаныя працэсы, самі прыродныя ўмовы пражывання, трывалая родавая структура грамадства і выпрацаваныя ў ім інстытуты ўлады, вайсковая арганізацыя, мужнасць і майстэрства адыгскіх ваяроў, а таксама сам свабодалюбівы характар гэтага народа садзейнічалі таму, што да XIX ст. ён ніколі не губляў самастойнасці цалкам.

У другой палове XVI ст. адыгі ўключаюцца ў арбіту маштабных міждзяржаўных працэсаў ва Ўсходняй Еўропе і становяцца адметным іх элементам. Пэўную ролю яны пачынаюць адыграваць і ў знешняй палітыцы ВКЛ. Як вынік — у 1561 г. Жыгімонт Аўгуст выдае пастанову, згодна з якой адыгскай артыстакратыі даваўся дазвол на ўезд у ВКЛ і адкрываўся доступ да службы на карысць вялікага князя літоўскага — «Лист княжатом петигорским, тым, которые бы хотели до Великого Князства Литовского на службу прыехати, вольно им будеть» [1, арк. 571; 22, p. 472]. У дакуменце гарантаваліся недатыкальнасць асобы і маёмасці, узнагарода, адпаведная сацыяльнаму статусу і годнасці, а таксама права свабоднага ад’езду на Радзіму. На гэта запрашэнне адгукнуўся шэраг адыгскіх князёў. Яны пераехалі ў ВКЛ са сваёй шматлікай світай. Асобныя з іх, верагодна, вярнуліся,

---

[3] Слова «шэрць» паходзіць ад арабска-пярсідскага «шэрт». У перакладзе з турэцкай мовы «шарт» — умова; дамова; пагадненне, замацаванае клятвай [15, 14].

але некаторыя — аселі на беларускай зямлі, атрымалі тут набілітацыю, кааптаваліся ў структуры грамадства і ўлады Вялікага Княства, сталі заснавальнікамі шляхецкіх родаў. Праект прыцягнення адыгаў на службу і жыхарства ў ВКЛ нагадвае знакаміты аналаг пры вялікім князі літоўскім Вітаўце — запрашэнне татар і габрэяў, хоць, відавочна, пазнейшы — меў меншыя маштабы. У рашэнні аб яго рэалізацыі быў шэраг прычын, што ва к другой палове XVI ст. набылі істотнае значэнне для ВКЛ: важнае стратэгічнае становішча Паўночнага Каўказа ў супрацьстаянні ВКЛ з Масквой на паўднёвым-уходзе ды і Крымам на Поўдні; цесная сувязь адыгаў з кіруючымі коламі тых жа Рускай дзяржавы і Крыма — дзвюма найбольш небяспечнымі суседзямі ВКЛ; высокія баявыя якасці адыгскага войска. Апошні фактар наўпрост паўплываў на стварэнне ў структуры ўзброеных сілаў ВКЛ асобнага віда сярэднеўзброенай кавалерыі — «пяцігорцаў» або «пяцігорскіх харугваў». Ён заняў прамежкавае становішча паміж гусарыяй — як цяжкой кавалерыяй, і конніцай, узброенай «па-валошску» або «па-татарску», згодна з іншымі данымі — «па-казацку», якая выконвала на полі бою ролю лёгкай кавалерыі [24, s. 44]. У гэтый сувязі заслугоўваюць увагі высновы гісторыка Г. Гралі, зробленыя ім пасля спецыяльнага вывучэння пытання адыгскай «эміграцыі» у ВКЛ. Сярод прычын і абставінаў азначанага працэса ён называе наступныя: 1) перанаселенасць каўказскага рэгіёну; 2) моцныя традыцыі наёмнай ваеннай службы сярод адыгаў, запатрабаванасць у іх за мяжой як у вайсковай сіле; 3) стаўка на саюз з Крымскім ханствам у знешняй палітыцы ВКЛ і Польшчы з канца 1550-х гг. як мера супрацьстаяння і барацьбы з Рускай дзяржавай ва ўмовах распачатай Інфлянцкай вайны, што прадугледжвала прыцягненне на свой бок і адыгскіх князёў. Да версій распаўсюджаных у гістарыяграфіі тэмы, але безпадстаўных, названы даследчык адносіў: 1) моцны ўціск адыгаў крымскімі ханамі; 2) выезд адыгскіх князёў у ВКЛ з рэлігійных меркаванняў з мэтай захаваць вернасць ісламу і не быць ахрышчанымі ў праваслаўе па загадзе расійскай улады. Адносна першай версіі абгрунтавана сцвярджаецца, што крымская дыпламатыя выступала медыятарам пры арганізацыі выезду адыгскіх князёў праз Крым на службу ў ВКЛ. Акрамя таго, вядома, што амаль адначасова з адыгамі ў ВКЛ у пач. 60-х гг. XVI ст. былі запрошаныя і татары. Другой версіі супярэчыць тое, што шэраг найбольш знакамітых у ВКЛ і Польшчы князёў, ахрышчаных да «эміграцыі», напрыклад Кудадэк-Аляксандр Сібокавіч, Гаўрыла Камбулатавіч Пяцігорскі, Цямрук Шымковіч Пяцігорскі, пасля пераезду ў ВКЛ заставаліся хрысціянамі [20, s. 25, 28; 21, s. 31]. Хрысціянамі засталіся і дзеці як мінімум двух апошніх дзеячоў.

У святле ўсяго азначанага ў межах даследавання тэмы можна сфармуляваць наступную навуковую праблему. Адыгі, якія асядалі ў ВКЛ, на сваёй Радзіме належылі да розных родаплемянных (субэтнічных) груп, а тыя ў сваю чаргу маглі адносіцца да лагераў, што дэманстравалі розны выбар у знешняй палітыцы эліт, знаходзіліся ў саюзе з рознымі дзяржавамі, як правіла — варожымі паміж сабой. Найбольш агульна дадзеная карціна ў 50-я – 60-я гг. XVI ст. выглядала так: заходнія адыгі знаходзіліся ў саюзе з Крымам, усходнія адыгі — у саюзе з Масквой. Першыя з іх былі прадстаўлены субэтнічнымі групамі жанэ (жана), бесленей, кеміргой (цеміргой) і інш. Другія былі пераважна кабардзінцамі. З улікам стану зацяжной вайны паміж ВКЛ і Рускай дзяржавай у другой палове XVI ст. субэтнічная прыналежнасць эмігрантаў набывала немалаважнае значэнне, часам станавілася дзейсным інструментам палітычнага і ваеннага супрацьстаяння, таемнай дыпламатыі. Больш таго, некаторыя адыгскія князі, якія траплялі на службу да вялікіх князёў маскоўскіх, самі або ў наступных сваіх пакаленнях увайшлі ў кіруючыя колы Рускай дзяржавы [12; 6; 18; 7; 8; 20; 21]. Адпаведна іх сваяцтва з адыгскімі нобілямі ў ВКЛ набывала істотную ролю ў міждзяржаўных стасунках другой паловы XVI – першай паловы XVII стст. У больш шырокім міжнародным маштабе фактар паходжання адыгаў Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, іх сувязі і ўплыў на Радзіме мог адыграць важную ролю ў межах папулярнага ў Еўропе ў другой палове XVI ст. праекта стварэння антытурэцкай ваеннай кааліцыі або т. зв. «турэцкай лігі». Крыніцы сведчаць, што пры яе арганізацыі дыпламатыя Габсбургаў і Ватыкана спрабавала задзейнічаць некаторых адыгскіх князёў, што пражывалі ў ВКЛ, устанавіць праз іх сувязі з адыгамі на Паўночным Каўказе, атрымаць інфармацыю аб геаграфіі рэгіёна, настроях у асяроддзі эліт і інш. [4; 5; 16; 23, s. 212–213, 290, 709].

Такім чынам, пытанне субэтнічнай прыналежнасці адыгаў у ВКЛ варта ўлічваць пры даследаванні гісторыі міжнародных адносін у Еўропе ў другой палове XVI – першай палове XVII стст. Гэта таксама — адна са складаючых задачы вызначэння рэгіёна паходжання ўсёй адыгскай «дыяспары» на Беларусі, шлях да высвятлення і ўдакладнення генеалогіі і біяграфіі некаторых найбольш значных адыгскіх дзеячоў у ВКЛ і Польшчы — князёў Кудадэка-Аляксандра («Олешки») Сібокавіча, Гаўрылы Камбулатавіча Пяцігорскага, Цемрука Шымковіча Пяцігорскага, Давыда Кансанкавіча (Кансаукавіча?) Пяцігорскага, Касіма Камбулатавіча Пяцігорскага і інш. Вывучэнне азначанай тэмы прадугледжвае таксама высвятленне ўсяго складу і значэння гістарычных паняццяў, якія прымяняліся ў розных відах крыніц для абазначэння адыгаў у ВКЛ у цэлым і асобных іх родаплемянных груп, у прыватнасці. Адпаведна аб’ектам такога

даследавання можа выступаць субэтнічная прыналежнасць адыгаў у ВКЛ, прадметам — этнонімы, гістарычныя паняцці, што выконвалі функцыю яе абазначэння. У дачыненні менавіта да айчыннай гісторыі важнай задачай у вырашэнні пытання пахожання групы адыгскіх князёў і іх падданых у ВКЛ выступае таксама правільнае суаднясенне назваў прадстаўнікоў гэтага этнасу, згаданых у гістарычных крыніцах XVI–XVII стст., з вядомай пазней той або іншай субэтнічнай групай адыгаў. Вырашэнне азначанай праблемы ўскладнена тым, што ў крыніцах адыгі ў цэлым і іх асобныя субэтнічныя групы, у прыватнасці, фігуруюць, як правіла, пад агульнымі назвамі. Часта яны маглі быць нададзеныя іншымі народамі, г. зн. з'яўляюцца «экзаэтнонімамі». Уласныя ж іх найменні — «эндаэтнонімы» — з'ява рэдкая. Акрамя таго, у выпадку ўжывання ў дакуменце яны часта аказваюцца змененыя ў канцылярыях органаў улады суседніх дзяржаў згодна з адпаведнымі ім моўнымі асаблівасцямі свайго часу. Як ужо адзначалася, у разглядаемы перыяд да адыгаў у ВКЛ прымяняліся пераважна назвы, што мелі абагульняючы характар — «пяцігорцы», «чаркасы», «пяцігорскія чаркасы», «пяцігорскія татары». Зразумела, што пад такімі абазначэннямі тут маглі выступаць розныя субэтнічныя групы адыгаў — кабардзінцы, жанееўцы, бесленееўцы і інш. Паказальна, што па даных даследчыкаў у персідскай мове слова «чаркас» («Circassian») азначае ўвогуле любога жыхара Каўказа на поўнач ад Дзербенту [18, p. 13]. У больш позні час (XIX ст.) пад «чэркесамі» маглі разумець субэтнічныя групы заходняй кабарды, адрозніваючы іх ад «кабардзінцаў» — усходніх адыгаў[4]. У такіх умовах становіцца бесперспектыўнай экстрапаляцыя значэння паняцця ў пазнейшы час на тое ж паняцце, але стагоддзем або двумя раней і наадварот. Толькі ў рэдкіх выпадках крыніцы ўтрымліваюць указанне на прыналежнасць «чаркаскіх» князёў да пэўнай, вядомай у навуцы субэтнічнай групы, напр. «абеслінскія чаркасы» — бесленееўцы; «джанскія», «дужаны», «жажэнскія» («жаженьские черкасские государи»), «жжанскія», «аджанскія» чаркасы — субэтнічная група жанэ або жана, ці жанееўцы [10, с. 390, спас. 4]. Аднак, як можна заўважыць, іх форма не заўжды ў поўнай меры будзе супадаць з пазнейшымі, вядомымі ў навуцы назвамі. У большасці ж, атаясаміць названыя этнонімы з той або іншай часткай адыгаў крайне праблематычна. Напрыклад, гэта праблема датычыцца князя Гаўрылы Камбулатавіча Пяцігорскага, паходжанне якога ў актавых крыніцах ВКЛ прадстаўлялася

[4] В. А. Пато (В. А. Потто, 1836–1911), расійскі ваенны гісторык, аўтар працы «Кавказская война», адзначаў адносна дзеянняў «черкесов» на правабярэжжы р. Кубань, што яны «заставляют бледнеть все ужасы чеченских и кабардинских набегов» (выдзелена — А. Л.). Адносна дадзенага фрагмента некаторыя даследчыкі гісторыі адыгаў заўважаюць, што пад «черкесами» тут меліся на ўвазе толькі заходнія адыгі.

як «с Петригорских Черкас»[5]. Традыцыйна ў гістарыяграфіі яго адносяць да кабардзінцаў, але такая субэтнічная ідэнтыфікацыя можа аспрэчвацца, канчатковага і дастаткова абгрунтаванага адказу на дадзенае пытанне ў навуцы пакуль не існуе. Тое ж можна заўважыць і ў дачыненні да іншых адыгскіх князёў у ВКЛ. Па-сутнасці, больш-менш упэўнена пакуль можна казаць аб субэтнічнай прыналежнасці толькі аднаго з такіх адыгскіх нобіляў — Кудадэка-Аляксандра («Олешки») Сібокавіча, сына жанееўскага князя Сібока-Васіля Кансаукавіча [12, с. 206, 233, спас. 191].

Такім чынам, першачарговае значэнне для даследавання гісторыі адыгаў у ВКЛ мае высвятленне этымалогіі, зместу і субэтнічнай складаючай найбольш пашыранай тут назвы — «пяцігорскія чаркасы», а таксама элементаў, што яе складаюць — «пяцігорцы», «чаркасы» — і іх варыянтаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). КМФ-18. Воп. 1. Спр. 37.
2. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 281.
3. *Аствацатурян Э. Г.* Оружие народов Кавказа. Санкт-Петербург: Атлант, 2004.
4. *Базылев Л.* Польско-Турецкие дипломатические связи в XVI в. // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв. М., 1979. С. 13–27.
5. *Ботвинник М. Н., Лурье Я. С.* Донесения агента императора Максимилиана аббата Цира о переговорах с А. М. Курбским в 1569 году (По материалам Венского архива) // Археографический ежегодник за 1957 г. Москва, 1958. С. 451–460.
6. *Дзамихов К. Ф.* Адыги в политике России на Кавказе (1550-е – нач. 1770-х гг.). Нальчик: Эль-Фа, 2001.
7. *Ерусалимский К. Ю.* Московиты в польско-литовском государстве второй половины XVI – начала XVII в: дисс. на соиск. уч. ст. докт. ист. наук. по спец. 24.00.01. Теория и история культуры. М. 2011.
8. *Ерусалимский К. Ю.* На службе короля и Речи Посполитой. М.; СПб.: Нестор-История. 2018.
9. История войны и владычества русских на Кавказе. Тифлис: Литогр. в воен.-топогр. отд. Кавказ. воен. округа, 1870. Карта Кавказского края к первому тому издания. Масштаб 1:1 680 000.
10. Кабардино-русские отношения в XVI–XVIII вв. Т. 1: XVI–XVII вв. М.: Издательство Акад. Наук СССР, 1957.
11. Кабардино-русские отношения в XVI–XVIII вв. Т. 2: XVIII вв. М.: Издательство Акад. Наук СССР, 1957.
12. *Кушева Е. Н.* Народы Северного Кавказа и их связи с Россией. Вторая половина XVI–30-е годы XVII в. Москва: Изд-во Акад. наук СССР, 1963.


[5] «…Князя Гаврыла Камбулатовича с Петригорских Черкас (выдзелена — А. Л.), которыи на имя и славу нашу господарскую з земли неприятеля нашого <…> выехал» [2, арк. 244]. Характар выдзеленай фармулёўкі да канца няясны. Магчыма таксама, што гэта абазначэнне з’яўлялася элементам прозвішча князя, якое пачынала фарміравацца, або — этнонімам, назвай этнаса, з якога паходзіў гэты дзеяч — «с петигорских черкас».

13. *Некрасов А. М.* Международные отношения и народы Западного Кавказа (последняя четверть XV – первая половина XVI века) // А. М. Некрасов. Избранные труды. Нальчик: Издательский отдел КБИГИ, 2015. С. 45–140.

14. *Ногмов Ш. Б.* История адыхейского народа, составленная по преданиям Кабардинцев Шора Бекмурзин Ногмовым. Тифлис: Типография Главного управления Наместника Кавказского, 1861.

15. *Сокуров В. Н.* Внешнеполитическое положение Кабарды в последней четверти XVII – первой четверти XVIII вв.: автореф. дисс. на соиск. уч. степ. канд. ист. наук по спец. История СССР. 07.00.02. Москва, 1977.

16. *Флоря Б. Н.* Проект антитурецкой коалиции середины XVI в. // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв. М.: Наука, 1979. С. 71–86.

17. *Хензель В.* Проблема ясыря в польско-турецких отношениях XVI–XVII вв. // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв. М., 1979. С. 147–158.

18. *Bushkovitch P.* Princes Cherkasskii or Cirkassian Murzas: The Kabardians in the Russian boyar elite 1560–1700 // Cahiers du monde russe. n. 45, 1–2 (janvier–juin 2004). P. 9–30. DOI : https://doi.org/10.4000/monderusse.8677.

19. Die Völker des Kaukasus. U. S. W. Justus Perthes, Gotha: 1848. Masstabe = 1:3 000 000 // Berghaus Physical Atlas. 8-te Abthailung: Ethnographie № 15. Georg. Kunstschule zu Potsdam.

20. *Grala H.* Czerkiesi i Nogajscy w służbie Rzeczypospolitej. Kilka uwag o najemnych i posiłkowych formacjach tatarskich w drugiej połowie wieku XVI // Prace naukowe Wyższej Szkoły Pedagogicznej w Częstochowie. Zeszyty historyczne. 1998. Zesz. V. S. 15–35.

21. *Grala H.* Książęta czerkiescy w XVI-wiecznej Rzyczypospolitej // Mówią wieki. 1997. № 6. S. 25–30.

22. Lietuvos Metrika. = Lithuanian Metrica = Mietryka Litewska = Литовская Метрика: Кn. 37 (1552–1561). Įžrašymų knyga 37. Vilnius: Lietuvos istorijos inst. leidykla, 2011.

23. Monumenta Poloniae Vaticana: w 8 t. T. 4: I. A. Caligarii nuntii apostolici in Polnia epistolae et acta Cracoviae: Sumptibus Academiae Litterarum Cracoviensis, 1915.

24. *Żygulski Z.* Broń wodzów i żołnierzy. Kraków: Kluszczyński, 2003.